## ЗАПЛЮШЧЫМ ВОЧЫ НЯБОЖЧЫКУ**

### I.

Заплюшчым вочы нябожчыку, выцягнем рэвальвэр зь ягонай кішэні і расстраляем крохкія муміі нашых жаданьняў. Калі на гук стрэлаў прыйдзе чалавек зь іржавай сякераю, сустрэнем яго ўдарамі думак у неба. Уначы, у парку імя пралетарскага пісьменьніка Горкага, вырвем адно аднаму языкі, выталупім вочы, вусны апусьцім у заімшэлыя воды Сьвіслачы. Абмыем твары восеньскай прахалодай; лізьнем сьляды нашай сяброўкі-рыбіны, якая ведае мову тапельцаў. Нарэшце, схаваемся ў цёплай лістоце пад старымі дрэвамі парку. Будзем ціха, як жабкі, сядзець і слухаць сымфоніі сьвету ў сваіх маленькіх галовах.

### II.

У нядзелю націсьнем рукамі на неба, каб анёлы сыпанулі нам цукру з карыцай і перцам. З промняў сьвятла і вібрацыі сэрцаў зробім агульнае цела для дрэваў, дамоў і паветра. Заменім стомленыя літары ў назовах плошчаў і вуліцаў. Запросім Калюмба распавесьці па радыё пра спрэчнасьць геаграфічных адкрыцьцяў і стратаў. Адкрыем Менск на ўсе бакі сьвету іператворым гарадзкія раёны ў матэрыкі. На плошчы Свабоды прыб’ем ветразь неба залатым цьвіком да асфальту.

### III.

Некалі мы гойсалі па вятрах, цалавалі паветра. Сьпявалі песьні на мове бяз словаў, гулялі ў вайну з уласнымі прывідамі. Крэмзалі ценярысы сноў, рабілі з мараў жыцьцё, а з жыцьця — успаміны. І калі пачалася зіма, холаду мы не адчулі: наша ружовая кроў ужо пульсавала ў жалезных жылах бязьлюднага гораду.

---

*** Фрагмэнт сэквэнцыі тэкстаў на тэму добрага надвор’я, якую мы са Зьмітрам Вішнёвым напісалі, па чарзе рэдагуючы адзін аднаго.*